У сучаснай бел. музыцы выразна выяўлены 2 формы ўзаемадзеяння галасоў і пластоў муз. Ф.: першасная (мадэляванне стыхійнага шматгалосся) і другасная (спадркаванае ўзаемадзеянне элементаў). Першасныя формы фактурнага ўзаемадзеяння (паралелізм, бурданіраванне, гетэрафонія, гласаабмен) выяўляюцца перш за ўсё ў творах фалькл. арыентацыі, а таксама ў сувязі з сакральнай вобразнасцю («Вясельныя песні» А.Мдывані, «Песні беларускага Паазер'я» Л.Захлеўнага, «Бандароўна» Г.Гарэлавай, «Літургія св. Іаана Златавуста» А.Бандарэнкі, «Missa gregoriana» А.Ліцвіноўскага і інш.). Другасныя формы звязаны з разнавіднасцямі кантрапункта, які функцыянуе пры наяўнасці гукавышынных умоў, характэрных для сучаснай музыкі (прэлюдыі А.Багатырова, сімфоніі Л.Абеліёвіча, Г.Вагнера, Д.Смольскага, Партыта in D У.Кузняцова і інш.). Першасныя і другасныя формы ўзаемадзеяння галасоў і пластоў муз. Ф. функцыянуюць ў цесным узаемадзеянні. Яркімі прыкладамі з'яўляюцца поліфанія пластоў і мікраполіфанія, якія ў шэрагу выпадкаў адначасова сумяшчаюцца.

*Літ.:* Скребкова-Филатова М.С. Фактура в музыке: Художественные возможности. Структура. Функции. М., 1985.

*А.Б.Пескін.*

**ФАЛЬКЛАРЫЗМ**, працэс засваення *фальклору* ў розных сферах культуры і мастацтва сучаснага грамадства. У наш час тэрмін «Ф.» найчасцей ужываецца ў значэнні працэсу адаптацыі, трансфармацыі і рэпрадукцыі фальклору ў жыцці і культуры (В.Гусеў, Д.Рыхтман-Аўгушціна, А.Аляхновіч і інш.). Вылучаюць наступныя тыпы Ф.: традыц. фальклор; *другасны фальклор*; *апрацаваны фальклор*; песні прафес. і аматарскіх аўтараў і кампазітараў, асобных калектываў, якія прайшлі працэс фалькларызацыі; стылізаваны фальклор; рэстаўрыраваны фальклор; рэканструяваны фальклор. Традыц. фальклор прадстаўлены ў маст. творчасці непасрэднымі носьбітымі традыцый: людзьмі старэйшага і сярэдняга ўзросту, якія жывуць пераважна ў сельскай мясцовасці, памятаюць старадаўнія абрады і звычаі, песні, танцы, казкі і інш. Але перанясенне аўтэнтычнага фальклору з натуральнага асяроддзя на сцэну заўсёды звязана са змяненнем. Менавіта таму гэты тып Ф. вызначаецца не як аўтэнтычны, а як традыц. Другасны фальклор узнаўляецца звычайна маладымі людзьмі, якія не з'яўляюцца носьбітамі традыцый. Апрацаваны фальклор выконваецца рознымі фалькл. калектывамі, ансамблямі, асобнымі выканаўцамі, нар. харамі. Пры гэтым не ўсе апрацоўкі захоўваюць арыгінал. Асабліва спрэчнымі з'яўляюцца некаторыя апрацоўкі для нар. хароў, выкананыя ў агульнаеўрап. ці рус. манеры выканання. Даволі часта кампазітары і аўтары тэкстаў выкарыстоўваюць пры стварэнні твораў змест, паэт. вобразнасць і структуру, якія характэрныя для нар. традыцыі. З цягам часу такія песні могуць атрымаць далейшае развіццё ў новых варыянтах і стаць народнымі. Тэрмін «стылізацыя» трактуецца навукоўцамі па-рознаму. Некаторыя вучоныя і практыкі ставяцца да стылізацыі адмоўна, лічаць яе падробкай, імітацыяй нар. песні. Пераканаўчыя стылізацыі пад сілу толькі высокакваліфікаваным кіраўнікам і выканаўцам. Пры рэстаўрацыі па рэштках узнаўляюцца элементы фалькл. традыцыі. Асаблівая ўвага надаецца ўспамінам носьбітаў абрадава-святочнай спадчыны. Менавіта так многія выканаўцы ў апошнія гады асвойваюць фальклор. Рэканструкцыя фальклору адбываецца на аснове дадзеных аб яго маст., эстэтычных, стыліст. асаблівасцях і функцыянальным прызначэнні. Крыніцай ведаў выступаюць друкаваныя працы па гісторыі культуры, фальклоры, этнаграфіі, мастацтвазнаўстве, асабістыя гутаркі са знаўцамі і носьбітамі традыцый. Вял. работу па рэканструкцыі і рэстаўрацыі фальклору вядзе засл. аматарскі фалькл. ансамбль «Крупіцкія музыкі».

*А.М.Аляхновіч.*

**ФАЛЬКЛОР**, вусная народная творчасць, народная паэтычная творчасць, від мастацкай творчасці народа, дзе рэчаіснасць адлюстроўваецца ў вобразах, створаных паэт. словам; важная частка духоўнай культуры беларусаў. Яму ўласцівы гуманізм, аптымізм, ідэі патрыятызму, справядлівасці і сац. роўнасці. Увасобленыя ў вуснапаэт. творчасці маральныя і этычныя нормы, эстэтычныя погляды, адносіны да працы адлюстроўваюць мараль і этыку народа, яго разуменне прыгожага, жыццёвыя прынцыпы і ўстаноўкі. Бел. Ф. адрозніваецца багаццем і разнастайнасцю абрадавай паэзіі, высокай мастацкасцю казак, раскрывае асаблівасці побыту і нац. характару беларусаў. Адзін з самых стараж. відаў Ф. — каляндарна-абрадавая паэзія, якая падзяляецца на зімовы (*калядныя песні*, *піліпаўскія песні* і інш.), веснавы (песні масленічныя, валачобныя, юраўскія, траецкія, куставыя, русальныя і інш.), летні (песні купальскія, пятроўскія, жніўныя, касецкія), восеньскі цыклы. У розныя перыяды земляробчага календара спяваліся талочныя песні, звязаныя з талакой — пашыраным у Беларусі відам калектыўнай узаемадапамогі. З самымі важнымі момантамі ў жыцці чалавека — нараджэннем, уступленнем у шлюб і смерцю звязана сямейна-абрадавая паэзія. Вельмі добра захаваліся ў беларусаў *радзінныя песні*, якія даюць магчымасць уявіць стан стараж. радзіннай паэзіі ўсіх усх.-слав. народаў. Песні пра каханне, сямейныя, антыпрыгонніцкія, рэкруцкія, чумацкія, сатыр., жартоўныя і інш. ўключае пазаабрадавая паэзія. Вял. пашырэнне атрымалі таксама *песні пра жаночую* долю, якая рэдка была лёгкай і шчаслівай (паказвалася цяжкая праца ў сям'і мужа). Сярод песенных жанраў ліра-эпічным складам і драм. напружанасцю вылу-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ